# АДМЕТНАСЦЬ АДЫЧНАГА ЖАНРУ Ў ПАЭЗІІ ЯНКІ СІПАКОВА

І .М Гоўзіч

Беларускі дзяржаўны педагагічны інстытут

Янка Сіпакоў з аднолькавым поспехам карыстаўся рознымі класічнымі (сталымі, традыцыйнымі) жанрамі. Побач з трагедыйнай па змесце баладай у яго існуе і сумная, ціхая элегія, і гучная, заклікавая ода. Ода, як вядома, у перакладзе з грэцкай мовы —"паэтычны, урачысты верш у гонар нейкай гістарычнай падзеі або выдатнай асобы"(1,346 — 347). Умовай для з'яўлення оды як жанра становіцца нейкая гераічная падзея, у ходзе якой выяўляюць сябе гістарычна-значныя ці міфалагічныя (у часы старажытнасці) героі, рэалізуюцца стыхійныя сілы прыроды. Спачатку ў Старажытнай Грэцыі одай называлі песню, што выконвалася хорам падчас танцаў, аднак у сваім агульнапрызнаным, "класічным" варыянце ода — дзіця эпохі класіцызму.

У наш час мастацтва слова пачало паступова адыходзіць ад вядомых традыцый адычнасці, у асноўным адмаўляецца ад гучнага пафасу, але выдатныя знаходкі ў рэчышчы набыткаў гэтага традыцыйнага жанру маюцца ў творчасці многіх беларускіх паэтаў. Як ні парадаксальна, але развіццю оды паспрыяла ў многім застойная эпоха, якая, нягледзячы на сваю двурушнасць і двуаблічнасць, ілжывую пафаснасць і ўстаноўкі на абстрактны, лозунгавы патрыятызм, скіравала многіх сумленных мастакоў не на абстрактнасць, не на рыторыку, а на глыбокае асэнсаванне мінулага (Уладзімір Караткевіч тут доўгі час лідзіраваў), вызначэнне філасофскай, унутранай сутнасці з'яваў, медытатыўнасць (немалыя дасягненні ў гэтым плане займеў Максім Танк), сатырычнае выкрыццё адмоўнага ў жыцці і адкрытае супроцьстаянне чыноўніцка-партыйнай дыктатуры (спадчына Пімена Панчанкі канца 50 -- 90-х гг.). Застойная эпоха паспрыяла нараджэнню жанравых разнавіднасцей оды -- элегічнай, медытатыўнай, сатырычнай і г. д.

Дэпалітызацыя (хоць і адносная) жыцця, паслабленне ідэалагічнага націску на асобу, супроцьстаянне членаў посткамуністычнага грамадства падаўленню чалавечых магчымасцяў і здольнасцяў вылілія ў паўнагучную адычную радасную, святочную мелодыю. Ода ў 80 — 90-я гг. зноў, як і раней, на працягу многіх стагоддзяў, стала сцвярджаць, а не адмаўляць.

Ода Янкі Сіпакова амаль не даследаваная, але вельмі цікавая з'ява, вартая пільнай увагі. З дапамогай гэтага жанру паэт змог апець не толькі гераічныя ўчынкі і подзвігі людзей, але і даць вывераную, філасофска-значную ацэнку падзеям, засяродзіцца на агульначалавечых праблемах, узняць звычайныя, светлыя і шчырыя пачуцці на адпаведную жанравай зададзенасці вышыню.

Для прыкладу разгледзім верш паэта адычнага гучання "Жанчына спявае". Звычайна ў гонар жанчыны складаюць санеты, пішуць рыцарскія раманы, але затое вобраз маці часцей прысутнічае ў одзе. Я. Сіпакоў у сваім творы ўсхваляе жанчыну ... праз песню, якую тая спявае і якой адмятае ўсе "крыўды і плёткі" і ўстанаўлівае гармонію ў свеце і ў душы:

Для песні трэба прычына,
Для песні трэба нямала...
Шануйма ж гэтак жанчыну,
Каб яна і у будні спявала! (2,159)

Верш гэты, безумоўна, адычны па сваім пафасе, настрою, падмацаванымі клічнай інтанацыяй. Аднак ён мае вельмі цікавую кампазіцыю: першая частка пабудавана як апісанне, а другая — гэта непасрэдны зварот да чытача. І гэта сведчыць пра сінтэз адзнак выяўленчай і эталагічнай паэзіі.

Перадумовай для ўзнікнення оды можа стаць і "стан душы" самога паэта. Напрыклад, сумная будзённасць так надакучыла паэту, што ён стварае своеасаблівую оду змагання са звыклым жыццём, заклікае чалавека адправіцца ў вандроўку ў "другое вымярэнне". У асобных одах Сіпакова "прабівае сабе дарогу" харэй, дапамагае стварэнню ўражання напружанасці, рытмічнай гнуткасці вершаванага радка і адпаведнай зместу твораў мелодыкі. Ужо на прыкладзе адзінай прааналізаванай намі оды паэта можна прыйсці да вываду пра тое, што яна вельмі далёкая ад класічнай. Аднак у гэтым заключаецца не яе стратнасць, а, наадварот, сведчанне пераадолення камернасці, замкнёнасці і ў змесце, і ў пафасе, і ў форме.

Вельмі прыкметныя адзнакі оды мае верш Янкі Сіпакова "У гасцях", якія напісаны чатырохстопным анапестам. Гэты памер у мастацтве слова часцей выяўляе ўрачысты настрой. У рамках яго вытрымана шмат эпічных твораў. Ён вельмі падобны да дактыля — вершаванага памера "Іліяды" і "Адысеі". Названы намі верш — ода вольным птахам-арлам, якія шмат у чым падобныя да чалавека і да якіх чалавек сам стараецца быць падобным:

Я шчаслівы ад думы: і ў мяне гэтаксама
Ёсць радзіма свая, свой народ, свая мама (2,162).

У паэта ёсць такі верш, дзе ўрачыстасць інтанацыі, адычнасць гучання ствараецца шматлікімі паўторамі, паралелізмам, паўзамі пасля першых словаў у радку. Такі твор умоўна можна назваць одай "пошуку свайго месца ў жыцці, сваёй прыналежнасці роду, народу":

Поле прагне абуджаныхсонцам зярнят,
Вёска — новых, прарослых ля вуліцы хат.
Мая песня гукае свой сціплы народ,
Каб у ім прарасці хоць на дзень, хоць на год (2,166).

Многа ў паэта і одаў памяці, у якіх прыгадваецца мінулая Вялікая Айчынная вайна, славіцца подзвіг вядомых і невядомых герояў. Да іх ліку адносяцца творы "Паранены партызан" і "Каска". Па свайму героіка-трагедыйнаму гучанню такія творы блізкія і да балады, і да элегіі, як бы канцэнтруюць у сабе маштабны, шматгранны пафас і змест, сведчаць пра размыванне жанравых рамак у літаратуры нашых дзён. Ад падобнага жанравага сінтэзу ў такога роду творах буйнаквецце тропаў ("Ах, блакада, — удаў валавокі!, "лес абмёрзлы"), павышаная экспрэсіўнасць і найвышэйшага гатунку лірызм: паранены партызан, відаць, перасохлымі ад смагі і чорнай скрухі вуснамі просіцца — "Я адзін... Падпаліце снягі, падпаліце снягі!" (2, 164).

У такога майстра жанраў і жанравых разнавіднасцей, як Янка Сіпакоў, кожны элемент верша — ад гукапісу і да пафасу — нязменна "працуе" на раскрыццё аўтарскай задумы. А задума найшчырэйшая і найгалоўнейшая ў яго — захаванне нацыянальнай годнасці народа, яго мовы, усведамленне сябе часцінкай роднага, крэўнага. У одзе "Роднае слова" мастак выкарыстоўвае ўсё, што адпавядае жанраваму настрою: пафас, вершаваны памер, тропы, рытміку. Героіка-трагедыйны пафас гэтага верша выліваецца ў своеасаблівую оду "пераадолення болю". Падобнаму адчуванню спрыяе самы пашыраны вершаваны памер XX стагоддзя ямб. У дадзенай канкрэтнай сітуацыі — пяцістопны. Працытуем урывак са згаданага верша. Пры цытаванні апускаем дакументальнага характару эпіграф (нячасты мастацкі прыём у сучаснай одзе) пра дзве забароны беларускай мовы як афіцыйнай — у 1697 г. сеймам Рэчы Паспалітай, у 1867 г. — царскім урадам:

Цябе забаранялі, як скрыжалі,
і адбіралі, быццам бы сцягі,

А крэслілі, —

здавалася, збівалі:

Як ад шпіцырутэнаў,

сінелі пісягі (2,167).

У сваіх одах пра народ, Радзіму, шматпакутную гісторыю Беларусі паэт робіць даволі смелы эксперымент: ён часта піша оды харэічным вершаваным памерам, дзякуючы чаму ствараецца незвычайна ажыўлены, рухомы, дынамічны малюнак, наслойваюцца адно на адно перажыванні, злучаюцца тэзісы, скрыжоўваюцца думкі. Але разам з тым у нас, чытачоў, не складваецца ўражанне цяжкасці і складанасці жыцця, невыноснасці сітуацыі, а, наадварот, мы нібы бачым САМ ПРАЦЭС ПЕРААДОЛЕННЯ ТРАГЕДЫЙНАГА ПАЧАТКУ. На нашых вачах адбываецца нараджэнне оды, складваецца чарговы гімн чалавечай (і народнай) мужнасці і сіле. Для падмацавання агульнага велічна-ўрачыстага настрою ў одзе "Зразумець, што ты народ..." паэт выкарыстоўвае яшчэ і адпаведныя настрою, агульнаму пафасу вобразы-сімвалы, па сутнасці, нашы нацыянальныя архетыпы, без якіх беларуская літаратура, пачынаючы з часоў старажытнасці, была б збедненай і не такой філасофска-заглыбленай, як зараз. Гэтыя вобразы, пастаўленыя ў адзін рад, аказваюць моцнае ўражанне на нацыянальна свядомага чытача: "РОД -- НАРОД — РАДЗІМА — НІВА — МАЦІ — МОВА — ПЕСНЯ -- БОЙ — РАНЫ — РАДАСЦЬ — УЗЛЁТ— НАРОД". Паэт, якому так хочацца стаць часцінкай свайго роду, народа. Толькі ў народзе яму жыць і канаць. Толькі народ дасць яму крылы:

Зразумееш, ты — народ,

Крык, як радасць, не стрымаеш

І падыме, нібы ўзлёт:

Я народ свой, людзі, маю! (2, 167 — 168).

Такім чынам, адычная лірыка Янкі Сіпакова гераічная і трагедыйная ў адначассе. Ода паэта не такая гучная, як у Пімена Панчанкі, ухваляе справы звычайнага чалавека, больш даверлівая і шчырая, эмацыянальная, а не рацыяналістычная, якой была ў творчасці класіцыстаў. Свет і чалавек у яго одах -- дынамічны, рухомы.

ЛІТАРАТУРА:


1 Рагойша В.П. Паэтычны слоўнік. — 2-е выд., дапрац. і дапоўн. -- Мн., 1987.

2 Сіпакоў Янка. Выбраныя творы ў 2-х тт. Т.І. Паэзія. – Мн., 1995.